ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 2 г. ТАЛАЧЫНА ІМЯ М.П. ЛУГОЎСКАГА»

# Распрацоўка ўрока беларускай літаратуры ў 8 класе па тэме “Аркадзь Куляшоў. Балада “Маці”

Аўтар:
Абухова Таццяна Аляксандраўна,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
тэл. +375 29 590 31 43

Талачын, 2024

**Мэта:** у канцы ўрока вучні паглыбяць веды пра баладу як ліра-эпічны жанр, прааналізуюць змест балады А. Куляшова “Маці”

**Задачы**: спрыяць паглыбленню ведаў пра баладу, аналізу зместу балады “Маці”; развіваць уменні аналізу ліра-эпічнага твора, выразнага чытання, вуснага маналагічнага маўлення, суадносіць літаратурны твор з іншымі творамі мастацтва; садзейнічаць выхаванню сямейных каштоўнасцей і эстэтычнага густу.

**Тып:** урок аналізу і асэнсавання твора.

**Абсталяванне:** партрэт Аркадзя Куляшова, мультыборд.

**Ход урока**

*Эпіграф:*

*Цябе на гэтыя паходы*
*Благаслаўляю, сыне мой,*
*Вялікай мужнасцю народа*
*І шчырай любасцю сваёй.*
*Хай беражэ цябе ад кулі*
*І ад варожых злых штыкоў*
*Святое пачуццё матулі –*
*Мая бязмежная любоў.*

*Пятро Глебка.*

**I.Аргмомант.**

**II. Уступнае слова настаўніка.**

- Сёння ў нас не звычайны ўрок, а своеасаблівая споведзь. Хацелася б, каб вашы сэрцы і душы былі адкрыты для шчырай размовы. А гаворка на ўроку пойдзе пра вобраз, якога не мінуў у сваёй творчасці ні адзін значны пісьменнік, мастак, скульптар, паэт. Гэты вобраз – увасабленне дабрыні, самаахвярнасці, бескарыслівасці. Ён называецца кароткім, але вельмі дарагім для чалавека словам – маці.

Маці – самы дарагі ў свеце чалавек. Ніхто не можа так шчыра любіць, як яна. Ніхто, як маці, не ўмее так цярпець і ахвяраваць сабой.

**III. Мэтавызначэнне.**

**IV. Актуалізацыя ведаў вучняў.** *1 варыянт.* Успомніце баладу, якую чыталі ў 7 класе, і на яе аснове назавіце адметнасці балады як ліра-эпічнага жанру. *(“Балада пра Вячку, князя людзей простых” У. Караткевіча)*

*2 варыянт:* Успомніце твор Аркадзя Куляшова, які чыталі ў 8 класе, і біяграфічныя звесткі пра аўтара. *(Верш “Бывай”, напісаны паэтам у 14-гадовым узросце)*

**V. Аналітычная работа над зместам балады “Маці”.**

- У гады Другой сусветнай вайны Аркадзь Куляшоў стварыў цэлы баладны цыкл пра подзвіг беларускага народа ў часы ліхалецця, у рамках якога вылучаюцца вершы-балады “Ліст з палону”, “Балада аб чатырох заложніках”, “Маці”. Яны грунтуюцца на пэўных выпадках, эпізодах, здарэннях і з’яўляюцца адбіткам суровай біяграфіі ваеннага пакалення. Балада “Маці” напісана ў 1943 годзе.

**1. Выразнае чытанне твора настаўнікам.**

**2. Высвятленне першаснага ўспрыняцця твора.**

-Ці спадабаўся вам твор?

- Якія думкі, пачуцці абудзіў?

- Над чым прымусіла задумацца балада?

**3.Тлумачэнне лексічнага значэння незразумелых слоў.**

• улашчыць – улагодзіць, задобрыць;

• гасцінец – вялікая бітая дарога, тракт;

• праклён – крайняе і беспаваротнае асуджэнне са злавесным пажаданнем;
• пякельны – тут: вельмі моцны;
• скарга – выяўленне незадаволенасці, наракание з прычыны непрыемнасцяў.

**4. Пытанні і заданні.**

**4.1.**- Назавіце герояў твора.

**-** Знайдзіце ў тэксце балады сюжэт народнай замовы (*так завуцца слоўныя творы чалавека, якімі ён спрабуе кіраваць сіламі прыроды на сваю карысць).*

**-** Чаму замова не дапамагла маці?

**-** Чаму не ўдалося дамовіцца з дарогай?

- Якое наступнае рашэнне прымае лірычная гераіня?

- На якія лагічныя часткі вы падзялілі б твор?

- Падумайце, якое значэнне мае будова твора для выражэння ідэі.

- Назавіце вобразы-сімвалы ў баладзе. *(Зерне, камень, дарога, вярба)*

- Якім бы вы назвалі фінал твора - трагічным ці жыццесцвярджальным?

- Які жанр вуснай народнай творчасці нагадвае твор?

- Прачытайце эпіграф да ўрока. Як ён суадносіцца з тэмай і ідэяй балады “Маці”?

**Фізкультхвілінка.**

**4.2. Работа ў парах.** Знайдзіце і выпішыце вобразна-выяўленчыя сродкі мовы і вызначце іх ролю ў баладзе.

**4.3**. Выкананне **індывідуальных заданняў** пры дапамозе сервісу LearningApps.

**5. Выразнае чытанне балады вучнямі па ролях.**

**6. Параўнанне літаратурнага твора з творамі жывапісу і скульптуры.**

1. Помнік Настассі Фамінічне Купрыянавай (Жодзіна. Беларусь), пяць сыноў якой загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
2. Помнік Анастасіі Акацьеўне Ларыёнавай у Омску (Расія).
3. Помнік салдацкай маці Праскоўі Ерамееўне Валодзічкінай (Расія).

- Што яднае дадзеныя скульптурныя кампазіцыі з вобразам гераіні балады А. Куляшова?

- Параўнайце творы жывапісцаў *(дэманструюцца рэпрадукцыі карцін Лукаса Кранаха «Мадонна з дзіцём пад яблыняй» і Аляксея Кузьміча з калекцыі «Мадонны, жанчыны-маці»)*. Адзін з іх створаны ў 1530 г., а другі ў сярэдзіне XX ст. Якую выснову можна зрабіць, гледзячы на выявы вобраза маці? *(Ва ўсе часы маці – гэта жанчына, якая любіць і шкадуе сваё дзіця, горне яго да сэрца, жадаючы абараніць ад розных нягод, дорыць цяпло.)*

- Ці адрозніваюцца вобразы маці на мастацкіх палотнах і на абразах? *(Вобразы маці і на мастацкіх палотнах, і на абразах вельмі падобныя, таму што кожная маці моцна любіць сваё дзіця. Калі яна глядзіць на яго, то вочы яе свецяцца дабрынёй і шчасцем.)*

**VI. Кантроль і карэкцыя ведаў.**

**Тэст**

**1. Жанр твора Аркадзя Куляшова “Маці”:**

А) паэма; Б) балада; В) элегія.

**2. Адзначце вобразы, якія ёсць у творы:**

А) каласы; Б) зерне; В) таполя; Г) дарога; Д) камень; Е) скала.

**3. Вобраз маці з’яўляецца сімвалам:**

А) самаахвярнасці; Б)свабоды; В) чысціні.

**Адказы: 1. Б; 2. Б, Г, Д; 3. А.** *(Узаемаправерка)*

**VI I. Абагульненне. Працягніце сказ.**

- Балада “Маці” напісана ў … (1943 г.)
- У цэнтры твора вобраз…, якая…
- Абагульнены вобраз маці сімвалізуе сабой…
- Ідэя балады…

**VIII. Д/з.** 1. Стар.235 (пыт.3,4). 2. Прачытаць артыкул “Балада” ў падручніку і назваць прыкметы гэтага жанру ў творы А. Куляшова. 3 Індывідуальнае заданне. Паведамленне “Кандрат Крапіва – байкапісец”.

**IX. Рэфлексія.**

- Што спадабалася на ўроку?

- Якія заданні выклікалі цяжкасці?

**X. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**